Вначале князья действуют как викинги. «С тем же взглядом они относились и к подчиненным народам: последние присуждались платить дань, и чем более можно было с них брать, тем более брали ...». Со временем вместо завоевательного движения, под влиянием народной жизни в самой стране, главной заботой князей становится сохранение завоеванных земель и основание личных государственных владений на завоевательном и наследственном праве.

Что касается нравственно-духовного развития русского народа в это время, то несомненным знаменательным событием следует признать крещение Руси в православную веру по византийскому образцу (988 г), значение которого в исторической судьбе русского народа невозможно переоценить.

Итак, два исторических события – образование «русской земли» и крещение Руси – явились одними из основных определяющих факторов дальнейшего развития русского государства и общества, критериями формирования национального права человека на достойную жизнь. Именно понятие «русская земля», как средство дальнейшей централизации власти и образования единого государства, и принятие христианской веры – закономерного события развития славянского общества, есть «...все то, что уготовано России пережить и преодолеть». Отсутствие искони устоявшегося понятия о частной собственности, а в связи с этим и соответствующего исторического народного образа мысли, определило судьбы народов России, способы формирования права на достойную жизнь. Отсюда во многом происходят впоследствии появившиеся течения славянофилов и западников, монархистов и декабристов, с их убеждениями, концепциями достойной жизни для русского народа.

Но право на достойную жизнь, как следствие культурно-исторического генезиса, не могло явиться ни результатом призыва варягов, ни результатом механического переноса в иные, более близкие к нам времена ценностей материальной и духовной культуры Запада. Оно должно было вырасти из корней собственно русской истории, из самобытности и культуры народа, способного не перенять, а в страданиях взлелеять это право как необходимое и естественное для него.

## БЕЛАРУСЫ II РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У КАНТЭКСЦЕ ЭТНІЧНЫХ ТЭОРЫЙ XX СТАГОДДЗЯ

***С.А. Фядзечка***

*Філіял УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт» у г. Пінску*

На пачатку XX ст. польска-беларускія адносіны ў чарговы раз змяняліся пад ціскам знешніх абставін. У выніку Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Усходняй Еўропы ўзнік шэраг новых дзяржаў з даўнімі традыцыямі дзяржаўнасці. Менавіта ў гэты час павінна была адбыцца рэканструкцыя традыцыйных адносін.

Праблема беларуска-польскіх адносін растварылася ў больш істотных праблемах стварэння беларускай нацыі. Напрыканцы XIX ст. дамінуючымі этнічнымі працэсамі былі спробы нацыянальнай кансалідацыі беларусаў ва ўмовах дамінавання рускасці ў грамадска-палітычным жыцці і яўрэйскага насельніцтва ў сацыяльна-эканамічным. Таму паўстаўшая ў 1918–1919-х гг. праблема адносін з новай польскай дзяржавай была калі не абсалютна новай, дык значна забытай і пératворанай дзякуючы тым мадэрнізацыйным працэсам, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі за апошняе стагоддзе.

Пры вывучэнні беларуска-польскіх адносін безумоўна актуальна праблема вызначэння сутнасці становішча беларусаў у II Рэчы Паспалітай. У гэтым выпадку патрэбна размежаваць такіе формы існавання этнасу, як этнічная група і меншасць. У большасці выпадкаў гэтыя формы аб'ядноўваюцца.

Аднак у сацыялогіі меншасцю прынята лічыць па ўжо стаўшым класічнай рабоце Вірта «групу людзей, якія з нагоды культурных ці геаграфічных умоў апынуліся ў грамадстве, у якім жывуць, з'яўляючыся аб'ектам інтэграцыйнай дыскрімінацыі». Гэта адзначае перад усім, што меншасць займае ў грамадстве горшую пазіцыю па шэрагу істотных для яе пытанняў і ўсведамляе гэта. Гэта не абавязкова павінна быць меншасная група ў сэнсе колькасці. Не кожная меншасць з'яўляецца этнічнай групай і не кожная этнічная група з'яўляецца меншасцю. Паняцце меншасці можна вызначыць праз сутнасць адносін з іншымі этнічнымі групамі, якіе прымаюць характар падпарадкавання як у палітычных і прававых пытаннях, так і ў эканамічным жыцці.

Вызначаючы сутнасць этнічных стасункаў, патрэбна адзначыць, што да фактараў, адзначаючых іх, можна аднесці дэмаграфічные стасункі, напружанасць і колькасць кантактаў паміж этнічнымі групамі; узровень і характар арганізацыі грамадска-палітычных груп; гісторыя і традыцыі ўзаемных кантактаў; ступень адрозненняў паміж гэтымі этнічнымі групамі ў розных галінах грамадскага, палітычнага і эканамічнага жыцця; культурные асаблівасці кантактуючых этнічных груп.

Вынікам падобных стасункаў павінна быць асіміляцыя. Істотнымі складаючымі працэсаў асіміляцыі з'яўляюцца інтэграцыя і акультурацыя. Інтэграцыя тычыцца сферы грамадскага жыцця, акультурацыя – сферы культуры.

Крэсы – гэта агульнае прадстаўленне. Будучы геаграфічным абшарам, яны мелі свае этнічныя, культурныя і эканамічныя асаблівасці. Назва «Крэсы» азначае не толькі эквівалент тэрыторыі, а перад усім азначае ўласцівую гэтым тэрыторыям гісторыю і цэлую сістэму міжэтнічных адносін. Канец XIX – пачатак XX ст. характарызуецца развіццём нацыянальнай свядомасці і нацыяналізмаў, якія пачалі адбівацца на грамадскім жыцці і ў Беларусі. Вялікая колькасць этнічных груп адзначала не толькі суіснаванне культур, але і дыстанцыю і варожасць. Крэсы II Рэчы Паспалітай, як паўночна-ўсходнія, так і паўднёва-ўсходнія, можна разглядаць як абшар этнічных канфліктаў.

Тэрмін «этнічны» ўжываецца да групы, аб'яднання, што не з'яўляецца яшчэ народам, але мае вялікія шансы стаць ім ці далучыцца да іншага народа. Гэты тэрмін ужываецца таксама адносна груп, якія праходзяць этап стварэння народа

ці народнасці. Істотнай часткай такіх груп з'яўляецца вера ў іх супольнае паходжанне, пачуццё агульнасці з іншымі членамі групы, узмацненне групы праз грамадска-палітычную сітуацыю. Дадатковымі фактарамі, узмацняючымі пачуццё агульнасці, з'яўляюцца мова, веравызнанне, культура, а таксама моцная сувязь з тэрыторыяй, якая стварае культурны арэал групы. Свядомасць групы растлумачваецца ў кантэксце існавання іншых груп. Фарміраванню свядомасці спрыяе існаванне іншага, агульнага ў адносінах да групы і асобы фактара, але ў гэтым выпадку пры існаванні шматэтнічных тэрыторый важна асобнасць і адрозненне груп і магчыма ўзнікненне агульных груп і сталых канфрантацый, у якіх група становіцца каля дылемы, кім яна з'яўляецца адносна іншых груп, што крысталізуе яе свядомасць.

Ва ўмовах стварэння новай польскай дзяржаўнасці асноўнай крыніцай рэгулявання становішча нацыянальных меншасцей на яе тэрыторыі было міжнароднае права. Па заканчэнні Першай сусветнай вайны ў Еўропе ствараецца сістэма бяспекі, заснаваная на Версальскіх мірных пагадненнях. Галоўнай геапалітычнай прычынай падпісання шэрагу дагавароў стаў не толькі факт сканчэння вайны, але і факт узнікнення новых дзяржаў на палітычнай мапе Еўропы. Неўпэўненасць краін-пераможцаў у этнічнай сітуацыі ў новых межах паміж такімі дзяржавамі, як Чэхаславакія, Румынія, Венгрыя, Польшча, Германія, Аўстрыя і інш. прывяла да ўзнікнення сістэмы міжнароднага права па забеспячэнню правоў нацыянальных меншасцяў.

Трактаты аб правах нацыянальных меншасцяў былі падпісаныя ў аднабаковым парадку прадстаўнікамі малых дзяржаў. Другі бок – вялікія еўрапейскія дзяржавы ў адносінах да сябе ніякіх абавязкаў не прымалі.

У Польшчы заканадаўства 1918–1939 гг. прадугледжвала раўнапраў'е грамадзян незалежна ад веравызнання, нацыянальнасці і мовы. Падобныя заканадаўчыя нормы ўтрымоўваліся ў канстытуцыях 1921 і 1935 гг., а таксама ў так званым малым Версальскім дагаворы ад 1919 г. Акрамя таго, Сейм неаднаразова прымаў пастановы ў абарону правоў нацыянальных меншасцяў.

Тым не менш, практыка адрознівалася ад тэорыі, улады паступова абмежавалі правы меншасцяў, ліквідавалі адукацыю на нацыянальных мовах. У другой палове 30-х гг. польскія ўлады намагаліся павялічыць эміграцыю, каб зменшыць беспрацоўе і перанаселенасць сельскай мясцовасці.

Такім чынам, асноўныя праблемы беларускай меншасці ў II Рэчы Паспалітай ляжаць у плоскасці непасрэдных дзеянняў польскага ўрада да беларусаў як да этнічнай групы, хаця больш адэкватнымі павінны выглядаюць адносіны да беларусаў, як да нацыянальнай меншасці.